**19.** Марскія хвалі, якія б'юць у бераг, – гэта … .

**А)** прывал. **Б)** прыбор. **В)** прыбой. **Г)** прыбаўка. **Д)** прыбудова.

**20.** Выберыце з прапанаваных словы, якія заканчваюцца на [**д**].

*1) завод; 2) град; 3) груд.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**21.** Прачытайце ўважліва прыклады:

*1) зубр; 2) зебра; 3) слон; 4) лось.*

У якіх словах усе зычныя цвёрдыя?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

**22.** Вучні запісвалі пад дыктоўку вершаваныя радкі Віктара Гардзея. Мірон напісаў:

*Веселяцца жабеняткі.*
*Звоняць конікі з нізін.*
*На парозе роднай хаткі*
*Толькі смоўж седзіць адзін.*

Колькі памылак зрабіў хлопчык?

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**23.** Прачытайце ўважліва прыказкі.

*1. Добрая слава даражэйшая … багацце. 2. Той герой, хто … Радзіму гарой. 3. Сем пятніц … тыдні.*

У якіх выразах на месцы пропуску неабходна напісаць прыназоўнік ***за***?

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** няма такіх выразаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

**24.** Прачытайце ўважліва народныя загадкі:

*1. Галава ў вадзе, а хвост на сушы. 2. Круглы, як сонца, шыпіць пад ім донца. 3. Не мора, а хвалюецца. 4. Жалезны нос у зямлю ўрос. 5. Ноччу лятае, а днём адпачывае.*

Калі вы правільна размесціце словы-адгадкі ў клетках красворда па гарызанталі, то ў вертыкальным выдзеленым слупку прачытаеце слова ***кніга***.




*а) плуг; б) блін; в) сава; г) ніва; д) коўш.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г, 5-д. **Б)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-д, 5-г. **В)** 1-в, 2-г, 3-д, 4-б, 5-а. **Г)** 1-г, 2-д, 3-а, 4-в, 5-б. **Д)** 1-д, 2-б, 3-г, 4-а, 5-в.


Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 18100 экз. Мінск. 2024 г.


# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2024»

*Чацвер, 22 лютага 2024 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Рыгоррыбачыўраніцайнарацэ.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**2.** Выберыце імёны дзяўчынак.

*1) Дар'я; 2) Міхал; 3) Марыя; 4) Ігнат.*

**А)** усе імёны. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**3.** Разгледзьце ўважліва малюнкі.



Суаднясіце малюнак са словам-адгадкай народнай загадкі:

*Кішэні не мае, а сонца хавае, стра́ху не мае, а ад ветру ўцякае, вачэй не мае, а слёзы праліва́е.*

**А)** акно. **Б)** хмара. **В)** дрэва. **Г)** палатка. **Д)** парасон.

**4.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Якуба Коласа:

*Ідзе вясна ў шумлівых водах,*
*У звонкім срэбры ручаёў.*

Падлічыце, колькі ўсяго назоўнікаў.

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**5.** Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае слова ў заклічцы?

*Мурашок-працаўнік,*
***Пільнуй** ясны дзень,*
*Каб не знік.*

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.



---

**6.** Як называецца прыгожая сіняя кветка, якая звычайна расце на полі ў жыце?

**А)** лебяда. **Б)** валошка. **В)** званочак. **Г)** сон-трава. **Д)** хвошч.

---

**7.** Прачытайце ўважліва словы:

*1) снег; 2) стог; 3) свет; 4) стук.*

Якія словы пачынаюцца з *[**с**]*?

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**8.** Выберыце з дадзеных словы, якія правільна падзелены на склады.

*1) шко-ла; 2) ало-вак; 3) ко-лер; 4) ма-шына.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**9.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Ніла Гілевіча.

*Як выходзілі сябры*
*ў дарогу на зары,*
*бралі яны рэчы,*
*клалі іх на плечы.*
*Грышка ўзяў палатку,*

*Цішка – коўдраў скатку.*
*Стась – тапор з рыдлёўкай,*
*Харч і посуд – Лёўка.*
*А сачкі з бляшанкай*
*узяў з сабою Янка.*

Колькі ўсяго сяброў збіралася ў дарогу?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**10.** Прачытайце народную загадку.

*Хто ў чырвоных ботах*
*Ходзіць па балотах?*

Вызначце адгадку, правільна паставіўшы пераблытаныя склады.

**А)** целдзя. **Б)** дзюбжакры. **В)** селбу. **Г)** сакгу. **Д)** рукцыце.

---

**11.** У народзе гавораць: *“У каваля **рукі** ў золаце.”* Вызначце склон выдзеленага назоўніка.

**А)** назоўны склон. **Б)** родны склон. **В)** вінавальны склон.
**Г)** творны склон. **Д)** месны склон.

---

**12.** Імёны бываюць поўныя і скарочаныя. Якія імёны з прапанаваных поўныя?

*1) Аляксей; 2) Тоня; 3) Святлана; 4) Сцёпа.*

**А)** усе імёны. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**13.** Дадзены словы на рускай мове:

*1) туча; 2) молния; 3) гроза; 4) изморозь.*

Падбярыце адпаведнікі ў беларускай мове:

*а) навальніца; б) маланка; в) шэрань; г) хмара.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-а, 2-б, 3-г, 4-в. **В)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б. **Д)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в.

---

**14.** Якой часцінай мовы з’яўляюцца словы *шпакляваць, рамантаваць, фарбаваць*?

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** прыслоўем. **Д)** займеннікам.

---

**15.** Выберыце з прапанаваных слоў назвы страў.

*1) талерка; 2) зацірка; 3) кубак; 4) дранікі.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**16.** Уважліва прачытайце наступныя словы:

*1) пчёлы; 2) сонца; 3) весна.*

Якія словы напісаны на рускай мове?

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**17.** Вызначце, у якіх выразах ёсць лічэбнікі.

*1) шукае ветру ў полі; 2) адзін другога не пераважыць;*
*3) адным калом плоту не падапрэш; 4) маладыя ад старых вучацца.*

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** няма такіх выразаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**18.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***ў***?

*1) па..ка; 2) га..ка; 3) во..к; 4) ча..нок.*

**А)** у 1, 2. **Б)** у 1, 3. **В)** у 2, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 4.